МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

# ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ
# (РАЗДЗЕЛ САЛОМАПЛЯЦЕННЕ)

Вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасцях
1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках)
1-15 02 01-07 – дэкаратыўна-прыкладное мастацтва
(рэстаўрацыя твораў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2012

Праграму распрацавала выкладчык кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва Шацiло А.В.

Рэцэнзенты:
Шпунт А.С.,
загадчык аддзела навукова-рэстаўрацыйных майстэрань НММ РБ
Мiцкевiч А.Г.
ст.выкладчык кафедры народнага ДПМ БДУКМ

**Зацверджана**

Кафедрай народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва установы адукацыi “Беларускi дзяржаўны унiверсiтэт культуры i мастацтваў” (пратакол № 10 ад 12.05.2012 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Установа адукацыi “Беларускi Дзяржаўны унiверсiтэт культуры i мастацтваў”

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Народнае мастацтва Беларусі – вялізарная частка нашай гістарычнай спадчыны і займае значнае месца ў духоўнай і мастацкай культуры краіны. Сярод розных формаў этнічнай свядомасці, што захоўваюць мінулае, традыцыйнае народнае мастацтва – адна з галоўных крыніц фарміравання сучаснай і будучай нацыянальнай культуры Беларусі, яно мае значны ўплыў на свядомасць і самавызначэнне асобы ў сістэме сусветных культур.

У мінулым саламяныя вырабы, якія мелі цесную сувязь з аграрнай абраднасцю, бытавалі ва ўсіх еўрапейскіх земляробчых народаў, але сваё захаванне і новае жыццё яны атрымалі толькі на Беларусі і зараз мастацтва саломапляцення, як уласна нацыянальная з'ява, стала важным элементам у культуры краіны.

Вывучэнне курса з'яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці "рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва".

Асноўны змест курса накіраваны на авалоданне тэхнікай і тэхналогіяй апрацоўкі матэрыялаў, вывучэнне традыцыйных форм і відаў ДПМ, методык рэстаўрацыі, а таксама ўзбагачэнне іх новымі мастацка-вобразнымі, кампазіцыйнымі, тэхналагічнымі прыёмамі.

Курс прадугледжвае:

- вывучэнне вытокаў і традыцый народнага мастацтва Беларусі
- засваенне тэхнік і тэхналогій апрацоўкі матэрыялаў
- засваенне тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі
- выкананне эскізаў мастацка-вобразнага, пластычнага і кампазіцыйнага вырашэння
- выкананне вучэбнай працы ў матэрыяле
- самастойную працу студэнтаў.

*Асноўнымі мэтамі* курса з'яўляюцца развіццё мастацкіх здольнасцяў студэнтаў, фарміраванне асобы мастака і яго нацыянальнай свядомасці праз далучэнне да традыцый народнага мастацтва.

*Задачы курса:*

- раскрыццё асаблівасцей традыцыйнай культуры Беларусі праз аналіз гісторыі рамяства;
- атрыманне ведаў па рэгіянальных асаблівасцях беларускага народнага ДПМ;
- развіццё мастацка-вобразнага мыслення;
- авалоданне выразнымі сродкамі дэкаратыўнай кампазіцыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- засваенне тэхік і тэхналогій рэстаўрацыі і кансервацыі твораў ДПМ, авалоданне асноўнымі прыёмамі
- фарміраванне практычных навыкаў і ўменняў, неабходных для стварэння і рэстаўрацыі мастацкіх твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця мастацтва саломапляцення Беларусі, традыцый народнай культуры, тэхнікі ітэхналогіі, а таксама практычныя навыкі пляцення, якія разглядаюцца і вывучаюцца на працягу двух семестраў па спецыялізацыі “рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”.

Метадалагічную аснову курса складаюць авалоданне рознымі тэхнікамі і тэхналогіямі апрацоўкі саломы, вывучэнне і захаванне традыцыйных прыёмаў формаўтварэння.

У выніку вывучэння курса студэнт павінен *ведаць*:

- асаблівасці розных відаў ДПМ
- уласцівасці і пластычныя магчымасці матэрыялаў;
- магчымасці дэкору
- абумоўленасць формы матэрыялам
- спецыфіку кампазіцыйнага вырашэння твораў ДПМ
- функцыі колеру ў творах ДПМ

*умець*:

выкарыстоўваць асноўныя законы ДПМ пры стварэнні твораў;

праяўляць вобразнае мысленне;

ствараць завершаную танальную, колеравую ці лінейна-пластычную кампазіцыю;

выкарыстоўваць дэкаратыўную стылізацыю формаў;

улічваць пры распрацоўцы твораў дэкаратыўныя якасці, уласцівасці і тэхналагічныя асаблівасці матэрыялаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН. ТЭХНАЛОГІЯ РЭСТАЎРАЦЫІ ТВОРАЎ ДПМ, РАЗДЗЕЛ САЛОМАПЛЯЦЕННЕ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцый | дробнагруп. | сам. раб. |
| **Раздзел І. Развіццё мастацтва саломапляцення.** | | | | |
| Тэма 1. Уводзіны: з гісторыі саломапляцення. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 2. Аграрна-магічныя функцыі саломапляцення. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 3. Традыцыйныя бытавыя рэчы з саломкі ў сялянскім побыце. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 4. Саламянае ўбранне цэркваў. | 6 | 2 | | 4 |
| Тэма 5. Развіццё саломапляцення ў ХХ ст. | 6 | 2 | | 4 |
| **Раздзел ІІ Тэхнікі і тэхналогіі пляцення з саломы.** | | | | |
| Тэма 1. Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу. | 20 | 2 | 8 | 10 |
| Тэма 2. Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла. Матэрыялы для рэстаўрацыі. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 3. Віды пляцення бытавых рэчаў, прынцыпы іх рэстаўрацы. | 40 | | 20 | 20 |
| Тэма 4. Пластыка з саламянай стужкі. | 12 | | 4 | 8 |
| Тэма 5. Традыцыі стварэння падвесных канструкцый з саломкі – павукоў. Рэканструкцыя як метад. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 6. Саламяная пластыка. Канструктыўныя прыёмы. | 50 | | 20 | 30 |
| **Раздзел ІІІ. Аплікацыя саломкай.** | | | | |
| Тэма 1. Мастацтва аплікацыі саломкай па дрэве і палатне. Матэрыялы для рэстаўрацыі. | 14 | | 4 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тэма 2. Прылады працы і тэхналагічныя асаблівасці аплікацыі саломкай. | 16 | | 6 | 10 |
| Тэма 3. Тэхніка і тэхналогія рэстаўрацыі аплікацыі. | 30 | | 10 | 20 |
| Тэма 4. Асноўныя віды аплікацыі саломкай. | 30 | | 10 | 20 |
| Усяго | 314 | 24 | 102 | 188 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### Раздзел І. Развіццё мастацтва саломапляцення.

**Тэма 1.** Уводзіны: з гісторыі саломапляцення.

Узнікненне саломапляцення з усталяваннем земляробства (2-1тыс. да н.э.). Асноўныя віды пляцення.

**Тэма 2.** Аграрна-магічныя функцыі саломапляцення.

Аграрна-магічная сімволіка дзеяння (рытуала, абрада) і матэрыяла. Абрады зажынак, дажынак (першы і апошні сноп, яго прадметна-фігуратыўнае ўвасабленне, вялесава барада); калядная абраднасць (традыцыйныя і новыя формы калядных упрыгожванняў), убранне ў салому; Выкарыстанне абрадавай атрыбутыкі з саломы да Вялікодна-вясновых і летніх святаў. Развіццё тэхнік пляцення з падзелам на бытавыя і абрадавыя.

**Тэма 3.** Традыцыйныя бытавыя рэчы з саломкі ў сялянскім побыце.

Падзел саламяных вырабаў на бытавыя і культавыя. Вітая круглая пляцёнка, ромбы. (Егіпецкая клетка, зерневыя лялькі, “вочы бога”)

1. Узнікненне саламянай пластыкі. Традыцыйныя канструктыўныя прыёмы.
2. Спіральнае пляценне. Выраб гаспадарчага посуду.
3. Плоскае пляценне. Віды саламяных стужак з рознай колькасці саломінак і вырабы з іх.
4. Выраб падвесных канструкцый з саломы як адзін з відаў пляцення. Асноўныя формы і традыцыі стварэння павукоў.

**Тэма 4.** Саламянае ўбранне цэркваў.

Саламяныя царскія брамы як адметная і ўнікальная з’ява ў прыкладным мастацтве Беларусі.

**Тэма 5.** Развіццё саломапляцення ў XX ст.

Саломапляценне XX стагоддзя. Адраджэнне і развіццё традыцыйнага саломапляцення ў 1960-1970-я гады. Развіццё жанру дэкаратыўнай саламянай пластыкі. Творчасць В.Гаўрылюк, Т.Агафоненка, Л.Главацкай, Л.Лось, Н.Кузняцовай, Т.Паўлоўскай, В.Салдатавай. Дзейнасць НДМЛ “Скарбніца”.

Сучасны стан мастацтва беларускага саломапляцення. Узнікненне ў XX стагоддзі новых тэхнік пляцення, новых канструктыўных і кампазіцыйных прыёмаў. Традыцыйныя і наватарскія канструктыўна-пластычныя рашэнні. Сучасная дэкаратыўная скульптура з саломкі. Пашырэнне магчымасцяў і зняцце абмежаванняў з дапамогай з’яўлення дадатковай асновы: каркасаў з дроту і пап’е-машэ.

## Раздзел II Тэхнікі і тэхналогіі пляцення з саломы.

**Тэма 1.** Тэхналогія апрацоўкі матэрыялу.

Нарыхтоўка саломы, захаванне нарыхтаванага матэрыялу. падрыхтоўка матэрыялу да працы. Афарбоўка і адбельванне саломы. Дапаможныя матэрыялы і прылады працы.

**Тэма 2.** Характарыстыка пластычных і фізічных якасцяў матэрыяла.

Пластычныя якасці саломкі.

**Тэма 3.** Віды пляцення бытавых рэчаў.

Спіральнае пляценне. Выраб гаспадарчага посуду. Плоскае пляценне. Віды саламяных стужак з рознай колькасці саломінак і вырабы з іх.

**Тэма 4.** Пластыка з саламянай стужкі.

Стварэнне малых дэкаратыўных формаў з саламянай стужкі: пацерак, квадраціка, васьміканцовай зоркі, “сонейка”, кутасоў. Тэхнікі стварэння розных відаў пялёсткаў.

**Тэма 5.** Традыцыі стварэння падвесных канструкцый з саломкі – павукоў.

Асноўныя формы. Модульны прынцып формаўтварэння. Модулі з роўнавялікіх і рознаразмерных саломін. Канструяванне павукоў з аднолькавых модуляў.

Прынцыпы рэстаўрацыі. Рэканструкцыя.

**Тэма 6.** Саламяная пластыка. Канструктыўныя прыёмы.

Традыцыйныя і наватарскія канструктыўна-пластычныя рашэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распрацоўка эскіза і выкананне твора на аснове традыцыйных і новых тэхналогій.

## Раздзел III. Аплікацыя саломкай.

**Тэма 1.** Мастацтва аплікацыі саломкай па дрэве і палатне.

Традыцыйныя народныя дываны з саламянай аплікацыяй.

**Тэма 2.** Прылады працы і асаблівасці тэхналагічныя асаблівасці аплікацыі саломкай.

Тэхніка і тэхналогія саламянай аплікацыі на розных паверхнях. Дапаможныя прылады працы і спосабы апрацоўкі саломы і падрыхтоўкі да работы.

**Тэма 3.** Тэхніка і тэхналогія.

Віды перапляцення саламянай стужкі. Тэхналогія геаметрычнай і крывалінейнай аплікацыі.

**Тэма 4.** Асноўныя віды аплікацыі саломкай.

Засваенне прыёмаў аплікацыі з саломкі.

Стварэнне традыцыйных формаў саламянай аплікацыі. Вобразнае вырашэнне твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Заданне 1.

Праца над эскізам твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва пад агульнай тэмай “Мастацкае ўвасабленне традыцый”

Заданне 2.

Выкананне ў матэрыяле па ўласным эскізе твора па тэме “Мастацкае ўвасабленне традыцый”.

## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. АСНОЎНАЯ.

1. Говор В.,Сахута Е. Художественные ремёсла и промыслы Белоруссии. – Мн., 1988.
2. Дегтяренко В., Починова Н. Инкрустация соломкой. – Мн., 1988.
3. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII-XVII стагоддзяў / Аўтар і складальнік Высоцкая Н.Ф. – Мн.: “Беларусь”, 1984 – 236 с.
4. Зайкоўскі Э.М. Месца Вялеса ў дахрысціанскім светапоглядзе насельніцтва Беларусі, – Мн., 1998. – 15 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Лабачэўская В.А. Збарагаючы самабытнасць. З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. – Мн.: “Беларуская навука”, 1998. – 357 с., іл.

6. Лобачевская О.А. Кузнецова Н.М. Возьми простую соломку. – Мн.: Полымя, 1988. – 142с.: ил.

7. Лобачевская О.А. Плетение из соломки. – М.: изд-во “Культура и традиции”, 2000. – 208 с.

8. Марозова С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі (1596-1839 гады) / Пад навук. рэд. Конана У.М. – Гродна.: ГрДУ, 2001. – 352 с.

9. Сахута Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1997. – 287с., іл.

10. Шкут Н.Н. Белорусские художественные промыслы (изделия из соломки и лозы). – Мн.: Наука и техника, 1985. – 158с.

11. Laye Andrew H.E. The Batsford Encyclopedia of Crafts. – London: BT Batsford LTD, 1978. – 431 p.

## ЛІТАРАТУРА ПА КУРСУ. ДАДАТКОВАЯ.

1. Беларускія народныя абрады. – Мн.: “Беларусь”, 1994. – 128с.

2. Васілевіч У.А. Беларускі народны каляндар. – Мн.:Ураджай, 1993. – 80с.:іл.

3. Гродненский историко-этнографический музей: Путеводитель по залам / Авт.-сост.: Соловьёва Е.А. и др. – Мн.: Полымя, 1986. – 206 с., ил.

4. Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. И Белорус. Полесье: Репринт. Воспроизведение изд. 1882г. – 2-е изд. – Мн.: БелЭн, 1994. – 550с.: ил.

5. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Укл. А.І. Гурскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 404с.

6. Казакова І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў. – Мінск: “Універсітэцкае”, 1995. – 151с.

7. Катовіч А., Крук Я. Зімовыя святы. – Мн.: “Мастацкая літаратура”, 2004. – 119 с.

8. Кацар М.С. Беларускі арнамент: Ткацтва, вышыўка. – Мн: БелЭн, 1996. – 208с.іл.

9. Коваль У.І., Новак В.С. Беларускія народныя святы і звычаі. – Гомель, 1993. – 88 с.

10. Кухаронак Т.І. Маскі ў масленічных абрадах беларусаў. – Мн.: Ураджай, 2001. – 239 с.: іл.

11. Ліцвінка В. Святы і абрады беларусаў. – 2-е выд. са змяненнямі. Мн.”Беларусь”, 1998. – 190с.: іл.

12. Лозка А. Беларускі народны каляндар. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: “Полымя”, 2002. – 240с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Моран А. История декоративно-прикладного искусства: от древних времён до наших дней – М.: Искусство, 1982 – 577 с., ил., 24 л. цв. ил.

14. Некрасова М.А. Народное искусство как часть культуры: Теория и практика. – М.Изобразительное искусство, 1983 – 343 с.

15. Frys-Pietraszkova E. Kunczynska-Iracka A. Pokropek M. Sztuka ludowa w Polsce. – Warszawa: Wydownictwo Arkady, 1988. – 400.

16. Muzeum v Grodnie Rozlnik II za rok 1924 z 3 ilustrajami. – Grodno, 1925.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ